сознание и вытеснит мысль о необходимости сохранить во что бы то ни стало освященные традиции, но во многих отношениях несостоятельные порядки.

Ланге оставил глубокий след в дальнейшей эволюции идеи социального правового государства. В теории социал-реформизма звучит и его струна о надежном средстве для прогресса солидарности и равенства, требующем и частной, и общественной, и государственной инициативы.

## ЛИТЕРАТУРА

1. Lange F. A. Die Arbeitfrage in ihrer Bedeutung fur Gegenwart und Zukunft. Duisburg, 1875.
2. Бердяев Н. А.. Ф.А. Ланге и критическая философия в ее отношении к социализму. 1899.

# АГРАРНАЯ РЭФОРМА Ў ПАЛЕСКІМ ВАЯВОДСТВЕ (1921–1939 гг.)

*В.П. Гарматны*
*Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт, г. Баранавічы, Беларусь*

Пасля падпісання 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага мірнага дагавору тэрыторыя Заходняй Беларусі ўвайшла ў склад чатырох ваяводств: Палескага, Наваградскага, Віленскага і Беластоцкага. Плошча Палескага ваяводства складала 36,825 тысяч км$^2$ з насельніцтвам каля 1,320 мільёна чалавек (1931 г.), і дзялілася на 10 паветаў: Брэст-Бужскі, Драгічынскі, Камень-Кашырскі, Кобрынскі, Косаўскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі, Сарненскі (з 1929 г. у складзе Валынскага ваяводства), Столінскі.

Аграрныя адносіны на тэрыторыі Палескага ваяводства характарызаваліся захаваннем значнай колькасці феадальна-прыгонніцкіх перажыткаў, панаваннем буйнога памешчыцкага землеўладання, беззямеллем і малазямеллем сялян, а таксама яго масавым збядненнем. У 1921 г. 82,0% усяго працаздольнага насельніцтва Палескага ваяводства было занята ў сферы сельскай гаспадаркі (у цэнтральнай Польшчы - 63,8%), на 1931 г. - 81,3% на Палессі і 61% у Польшчы. Глеба пераважна бедная, пясчаная - ураджай жыта складаў прыкладна 480-800 кг з га, у Польшчы - 1136 кг з га. 40% тэрыторыі Палескага ваяводства было забагнена [1, s. 110-115]. У 1922 г. каля 4500 памешчыцкіх гаспадарак (0,9% усіх гаспадарак) валодала амаль 4,7 млн гектараў (58% прыватнаўласніцкай зямлі), вядучае месца ў памешчыцкім землеўладанні займалі буйныя латыфундыі плошчай ад 2 да 10 і болей тысяч га зямлі. Каля 500 магнатаў мелі больш як па 1000 га. Такой канцэнтрацыі зямельнай уласнасці не было ні ў адной з тагачасных краін Еўропы [2, s. 67]. Асобныя зямельныя магнаты (Радзівіл, Патоцкі, Сапега, Тышкевіч, Мяйштовіч, Рачкевіч і інш.) валодалі дзесяткамі тысяч гектараў зямлі. Так, уладанні князя Караля Радзівіла толькі ў Столінскім павеце ("Давідгрудэк") складалі звыш 155 200 га [3, с. 31]. На іншым баку знаходзілася каля 480 тысяч сялянскіх гаспадарак (больш 99% сельскагаспадарчага насельніцтва), якія валодалі толькі 3,3 млн га (42%) зямлі , прычым 8250 сялян-палешукоў мела ў сярэднем па 0,5 га, а многія былі зусім беззямельнымі. У 1927 г. у Палескім ваяводстве колькасць сялян, якія не мелі каня, складала 34,7% гаспадарак, аднаго каня мелі 50,9%. Не мелі кароў 15% гаспадарак, а 18,6% гаспадарак мелі карову, але не мелі каня [3, с. 31; 50; 4, с. 40].

Сяляне задыхаліся ад недахопу зямлі; цераспалосіцы - у вёсцы нарастала сацыяльная напружанасць. Каб палепшыць матэрыяльнае становішча мясцовых сялян польскаму ўраду жыццёва неабходна было як мага хутчэй правесці аграрную рэформу.

У Сейме была створана камісія аграрных рэформ. 10 ліпеня 1919 г., у перыяд пад'ёму ў Польшчы рэвалюцыйнага руху, Сейм па прапанове ўрада Падэрэўскага прыняў так званыя "Прынцыпы зямельнай рэформы", згодна якіх ствараўся

дзяржаўны зямельны фонд з свабодных зямель. У кіруючых колах палітычных партый і ўрадавых сферах ішло абмеркаванне розных праектаў аграрнай рэформы. Праз год – 15 ліпеня 1920 г. – у час найбольшай небяспекі для існавання Польскай дзяржавы, калі Чырвоная Армія стаяла пад сценамі Варшавы, Сейм у хуткім парадку прыняў новы закон: "Выканаўчыя правілы да закону аб зямельнай рэформе ад 10 ліпеня 1919 г.", якія прадугледжвалі надзяленне зямлёю малазямельных і беззямельных сялян, але на практыцы быў ажыццёўлены зусім іншы праект рэформы – больш кансерватыўны. У канцы 1924 г. урад В. Грабскага выступіў з новым законапраектам па аграрнаму пытанню. 26 ліпеня 1925 г. Сейм адхіліў заканапраект левых партый і прыняў шырокавядомы "Закон аб правядзенні зямельнай рэформы", які ўвайшоў у гісторыю пад назвай "Закон аб парцэляцыі і асадніцтве" [5, s. 215].

Асноўная мэта, якую праследаваў польскі ўрад у Палескім ваяводстве, была ў тым, каб насадзіць тут на пустуючых землях вайсковых асаднікаў-каланістаў з ліку былых удзельнікаў савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. і стварыць такім чынам сацыяльную і палітычную апору на "Крэсах Усходніх", каб каланізаваць гэтую тэрыторыю, а таксама ўмацаваць становішча найбольш заможных сялян, пашырыць унутраны рынак.

Для вызначэння зямель, якіх можна было адвесці пад "асады", ствараліся сумесныя камісіі з прадстаўнікоў Міністэрстваў рольных рэформ, фінансаў, вайсковых спраў. Галоўнымі крытэрыямі былі: якасць і колькасць свабоднай зямлі, а таксама яе аддаленасць ад шляхоў зносін. Так, прадстаўнік Міністэрства вайсковых спраў паручнік Лявон Грушніцкі 26-27 кастрычніка 1922 г. ездзіў у маёнтак Толшча Высока-Літоўскай гміны Брэсцкага павету для агляду зямель пад будучыя асады – дзяржава кампенсавала яму кошт чыгуначнага білету ў 1000 марак, а таксама праезд амнібусам ад станцыі да месца прызначэння – 400 марак [6. – Арк. 32].

Асаднікі атрымоўвалі тут па нізкім кошце ці навогул бясплатна па 15-45 га зямлі ў залежнасці ад воінскіх заслуг і звання: па прынятаму правілу палкоўнік атрымоўваў 30 гектараў зямлі, капітан – 20, паручнік – 15, радавы – каля 9–10 га [7, с. 73–74], але былі і выключэнні з гэтага правіла. Дзеля атрымання зямлі асадніку неабходна было знайсці двух паручыцеляў, якія б неслі адказнасць у выпадку яго неплацежаздольнасці. Здараліся і унікальныя выпадкі: у маёнтку Баравікі Косаўскай гміны Косаўскага павету пасялілася з Кракаўскага ваяводства сям'я вайсковага асадніка Францішка Стылінскага. Бацька атрымаў 44,79 га зямлі, а яго сыны: Мар'ян – 25,03 га, Ян Стылінскі – 24,69 га. Пры гэтым бацька і сыны выступілі паручыцелямі адзін аднаго. Гэтыя асаднікі сумесна валодалі шматлікімі прыладамі працы, вялікай колькасцю сельскагаспадарчай жывёлы і птушак, кожны з іх уносіў на свой надзел больш чым тону ўгнаенняў, што забяспечвала на іх землях добры ўраджай [8. – Арк. 63].

Памер аплаты за зямлю быў прыроўнены да 30-100 кг збожжа за 1 га штогод з выплатай дзяржаве на працягу 30 гадоў, пачынаючы з пятага года пасля атрымання зямлі. Дзяржава аказвала дапамогу натурай або грашыма для абзавядзення гаспадаркай. На гаспадарку выдзялялася 80 м$^3$ будматэрыялаў і 2 млн марак грашыма, інвентаром або зернем. Асаднік павінен быў пасяліцца на сваім водрубе на працягу года і ў трохгадовы перыяд асвоіць яго.

Асаднікам праз Дзяржаўны банк выдаваліся ільготныя крэдыты пад 4–7% гадавых, але здараліся асобныя выпадкі, што некаторыя з іх не маглі своечасова выплаціць патрабуемыя сродкі: так, у 1930 г. асаднік маёнтка Варацэвічы Іванаўскай гміны Драгічынскага павету Ісідор Ласковіч не здолеў своечасова выплаціць узятую пазыку з працэнтамі ў памеры 1073,33 злотых. Банк абавязаў яго выплаціць гэтую суму на працягу двух наступных гадоў [9. – Арк. 5].

Ужо ў пачатку 1923 г. для асаднікаў ў Палескім ваяводстве было выдзелена 128 тысяч гектараў: Брэсцкі павет – 6 тысяч га, Пружанскі – 5,5 тыс., Драгічынскі – 8 тыс.,

Кобрынскі – 6 тыс., Косаўскі – 10 тысяч га і г.д.. Да 1 студзеня 1923 г. тут расселены 991 асаднік [7, с. 77; 10, с. 17]. Вайсковым каланістам для арганізацыі гаспадарак дзяржава бясплатна выдзяляла коней, буйную рагатую жывёлу, свіней. Толькі ў 1922 г. вайсковыя асаднікі Брэсцкага павета атрымалі 180 коней, 200 кароў, 90 авечак, 140 свіней, 4000 пудоў зерня для пасеву, 5000 пудоў бульбы [11, с. 31].

КОЛЬКАСЦЬ АСАДНІКАЎ НА 1 СТУДЗЕНЯ 1923 г. [12, с. 15]

| колькасць асаднікаў у Палескім ваяводстве | з іх | |
|---|---|---|
| | арганізаваліся | не змаглі |
| 1477 | 991 | 486 |

У мэтах бяспекі асаднікі сяліліся супольна хутарамі, мелі права насіць і валодаць зброяй, нават кулямётамі, – усе меры перадасцярогі не былі дарэмнымі, бо назіраліся выпадкі разгрому асадніцкіх хутароў і памешчыцкіх маёнткаў партызанамі і паўстаўшымі сялянамі: напрыклад, у ноч на 27 жніўня 1923 г. яны разграмілі асаду Целяханы, а 24 верасня 1924 г. маёнтак Юзефуў Беразноўскай гміны Пінскага павету, у ноч з 2 на 3 кастрычніка 1924 г. партызанскі атрад у складзе 30 чалавек разграміў маёнтак і атакаваў пастарунак у Кажан-Гарадку Столінскага павета [13, с. 68].

Узаемаадносіны сялян Палескага ваяводства з мясцовымі вайсковымі асаднікамі былі паважлівымі і добразычлівымі: палешукі заўсёды запрашалі асаднікаў на свае святы і ўрачыстасці, прадастаўляючы ім пачэсныя месцы ў першых радах, многія асаднікі бралі ў жонкі мясцовых сялянак, дзеці вайсковых асаднікаў і навакольных сялян гадаваліся разам, але адносіны з мясцовымі памешчыкамі ў вайсковых асаднікаў былі складанымі, бо тыя бачылі ў іх сваіх непасрэдных эканамічных канкурэнтаў [14, s. 226].

Парцэляцыя – продаж зямлі дробнымі надзеламі (парцэламі) – праводзілася за кошт дзяржаўных, памешчыцкіх і пустуючых земель: былыя ўладанні царскай сям'і, кінутыя маёнткі і сялянскія гаспадаркі, на якіх не аб'явіліся законныя ўладальнікі (бежанцы), а таксама царкоўныя і іншыя землі [15, s. 21].

ПАРЦЭЛЯЦЫЯ Ў ПАЛЕСКІМ ВАЯВОДСТВЕ (1921-1925 гг.) [7, с. 104]

| год | від парцэляцыі і памер атрыманага надзела (га) | | |
|---|---|---|---|
| | дзяржаўная | іншая | усяго |
| 1921 | 1276 | 2640 | 3916 |
| 1922 | 13309 | 5522 | 18831 |
| 1923 | 12137 | 6936 | 19073 |
| 1924 | 5333 | 3491 | 8824 |
| 1925 | 9427 | 6539 | 15966 |
| усяго | 41482 | 25128 | 66610 |

У плане правядзення аграрнай рэформы прадугледжвалася і ліквідацыя цераспалосіцы (камасацыя). Гэта азначала правядзенне масавай хутарызацыі сялянскіх гаспадарак, стварэнне фермерскіх гаспадарак. 31 ліпеня 1923 г. быў выдадзены закон аб камасацыі. Сяляне павінны былі плаціць за камасацыю кожнага гектара зямлі ў залежнасці ад яе якасці ад 14 да 20 злотых, а таксама за складанне праектаў меліярацыі, утрыманне землеўпарадчыкаў, перанясенне дарог і г.д. Таму камасацыя першапачаткова праходзіла даволі марудна. З мэтай паскарэння хутарызацыі 14 студзеня 1927 г. выдадзена сумеснае распараджэнне Міністэрства земельных рэформ і Міністэрства фінансаў аб аказанні дапамогі сялянам, якія выходзілі на хутары. На 15-гадовы тэрмін выдаваўся крэдыт: 1200 злотых на перанос будынка і 600 на меліярацыю.

КАМАСАЦЫЯ СЯЛЯНСКІХ ГАСПАДАРАК ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА [7, с. 164]

| колькасць вёсак, | колькасць гаспадарак, | плошча зямлі, падзеленай |
|---|---|---|

| перасеrange на хутары | выйшаўшых на хутары | на вотрубы, га |
|---|---|---|
| 384 | 54883 | 500840 |

У 1921 г. болей паловы сялян карысталася сумеснымі зямельнымі ўладаннямі (сервітутамі), агульная плошча якіх складала каля 438 тысяч гектараў (каля 15% усёй сялянскай зямлі). Сервітуты былі, з аднаго боку, перажыткам з часоў паншчыны і феадалізму, з другога – жыццёва неабходнай для мясцовых сялян рэччу: давалі ім магчымасць свабодна трымаць на выганах, пашах большую колькасць сельскагаспадарчай жывёлы, а на вадаёмах - вялікую колькасць хатняй птушкі, лавіць рыбу, лес для пабудовы хаты і іншых неабходных сельскагаспадарчых пабудоў, нарыхтоўкі дроў, магчымасць бесперашкодна збіраць ягады, грыбы, мох. У цэлым сялянства выступала рэзка супраць ліквідацыі сервітутаў, бо пры гэтым страчвала больш, чым атрымоўвала ўзамен. Таму ліквідацыя праходзіла з вялікімі цяжкасцямі.

СЯЛЯНСКІЯ СЕРВІТУТЫ Ў ПАЛЕСКІМ ВАЯВОДСТВЕ [7, с. 86, 163]

| лясныя | выганы і пастбішча | лясы і пастбішча | іншыя |
|---|---|---|---|
| 13,2% | 68,1% | 18,6% | 0,1% |

ЛІКВІДАЦЫЯ СЕРВІТУТАЎ У ПАЛЕСКІМ ВАЯВОДСТВЕ (1919–1936 гг.)

| ліквідавана сервітутаў | колькасць пацярпелых сялянскіх гаспадарак | выдзелена ўзамен сервітутаў зямлі, га |
|---|---|---|
| 441 | 43113 | 110624 |

У барацьбе за свае правы сяляне выкарыстоўвалі як легальныя, так і нелегальныя сродкі барацьбы. Так, у інтэрпеляцыі беларускіх паслоў у Сойм у сувязі з прыгнётам сялян асаднікамі адзначалася: "Асаднік, капітан Стылінскі, захапіў сервітутны луг, які належаў сялянам вёскі Квясевічы Косаўскага павету. Пагражаючы зброяй, асаднік не пускае сялян пасці жывёлу на сервітутнай зямлі" [10, с. 84].

Здараліся выпадкі, калі выступленні сялян арганізоўвалі прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі - ў сярэдзіне студзеня 1923 г. солтыс Сіманюк сабраў жыхароў вёсак Аннапаскі, Ямніца і Хмелішча Олтушскай гміны Брэсцкага павета і прызваў іх пайсці ў сервітутны лес, каб прагнаць адтуль інжынера Май-Мескулава. За солтысам пайшлі 35 сялян і выгналі з лесу камендантa паліцыі Хамяка, Май-Мескулава і рабочых. Сяляне заявілі, што лічаць лес сваёй уласнасцю і не дазволяць яго пілаваць [7, с. 191].

У верасні 1929 г. каля 200 сялян з вёсак Осаўцы і Пляхаўшчына Пружанскага павета, узброеныя сякерамі і кіямі, прагналі каморніка і 3 паліцэйскіх, якія разам з ім адводзілі сервітутныя землі памешчыку. Толькі з дапамогай атрада ў 30 паліцэйскіх з 2 кулямётамі уладам удалося правесці зямельнае размежаванне [12, с. 100–101].

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што аграрная рэформа польскіх улад у Палескім ваяводстве садзейнічала ліквідацыі паўпрыгонніцкіх перажыткаў, расчышчала шлях для развіцця капіталізму ў вёсцы. Паказчыкі прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі ў 30-я гады значна выраслі і дасягнулі ўзроўню Францыі і ЗША, а часткова нават пераўзышлі іх, павялічылася колькасць свойскай жывёлы, але на праўдзенне рэформы негатыўна адбіўся сусветны эканамічны крызіс 1929-1933 гг., а затым і пачатак Другой Сусветнай вайны, таму рэформа не змагла вырашыць аграрнага пытання.

## ЛІТАРАТУРА


1. Tomczonek, Z. Wieś Poleska 1918-1939 / Z. Tomczonek. // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёну Беларусі: Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. У 2 ч. Ч. 2. – Брэст: Выдавецтва С. Лаўрова, 1998. – С. 110-115.
2. Galka, B.W. Ziemianie i ich organizacje w Polsce lat 1918-1939 / B.W. Galka. // – Torun: Adam Marszalek, 1999. – 214 s.;
3. Полуян, И.В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса. 1929-1933 гг. / И.В. Полуян. // – Минск: Навука і тэхніка, 1991. – 207 с.;

4. Мацко, А.Н. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнёта буржуазии и помещиков (1918-1939 гг.) / А.Н. Мацко. // – Минск: Беларусь, 1972. – 336 с.;
5. Historia chlopow polskich / pod redakcja Stefana Inglota. – Wroclaw: Wydawnictwo Uniwersytetu Wroclawskiego, 1995. – 395 s;
6. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 6. Заявления военных осадников о выдаче ссуды;
7. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920-1939 гг.) / А.А. Сорокин. // – Минск: Наука и техника, 1968. – 204 с.;
8. ДАБВ. – Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 77. Заявления военных осадников о выдаче ссуд;
9. ДАБВ. – Ф. 60. – Воп. 1. – Спр. 158. Дело о наделении землёй военного осадника Ласковича Исидора 1930 г. имение Вороцевичи гмина Яновская повет Дрогичинский;
10. Кон, Ф.Я. Западная Белоруссия – колония панской Польши (к процессу над белорусской громадой) / Ф.Я. Кон. // – Москва: Издательство ЦК МОПР СССР, 1928. – 38 с.;
11. Кухарев, Б.Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919-1939 гг.) / Б.Е. Кухарев. // – Минск: Вышэйшая школа, 1975. – 112 с.;
12. Полуян, В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927-1939 гг.) / В.А. Полуян. // – Минск: Наука и техника, 1978. – 360 с.;
13. Полуян, В.А., Полуян, И.В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920-1939 гг. / В.А. Полуян. // – Минск: Государственное издательство БССР, 1962. – 224 с.;
14. Stobniak-Smogorzewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe 1920-1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. // – Warszawa, RYTM, 2003. – 420 s;
15. Ludkiewicz, Z. Wytyczne reformy agrarnej na Bialej Rusi / Z. Ludkiewicz. // – Warszawa: Wydawnictwo STRAŻY KRESOWEJ, 1920. – 40 s.

## БЕЛАРУСКІЯ ТАТАРЫ Ў ПАРТЫЗАНСКІМ РУХУ ПАДЧАС ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

*Грыбава С.У.*
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, г. Мінск, Беларусь

Беларускія татары разам з іншымі народамі СССР, у тым ліку Беларусі, удзельнічалі ў Вялікай Айчыннай вайне, уключаючы і партызанскі рух. Гістарычна склалася такім чынам, што ў асноўным трывалыя паселішчы беларускіх татар размясціліся ў заходніх рэгіёнах краіны. Так, дадзены артыкул прысвечаны ўдзелу ў партызанскім руху дадзенай нацыянальнай меншасці ў складзе брыгад партызанскіх злучэнняў Баранавіцкай, Вілейскай, Пінскай абласцей. У брыгадах Беластоцкай і Брэсцкай абласцей беларускія татары прадстаўлены не былі. [1] Артыкул падрыхтаваны на падставе матэрыялаў Нацыянальнага архіва РБ. У ім прыводзіцца шэраг найбольш характэрных прыкладаў дзейнасці татар, жыхароў Беларусі, у партызанскім руху ў заходніх рэгіенах краіны.

У атрадзе імя Аляксандра Неўскага брыгады імя Аляксандра Неўскага, якая дзейнічала ў Юрацішкоўскім і Іўеўскім раенах Баранавіцкай вобласці (у дадзеным выпадку і далей па тэксту тэрыторыя дзейнасці брыгад падаецца па адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу на 1.01.1944 г.), змагаліся з ворагам браты Якубоўскія: Адам і Абрагім Мустафавічы з в. Кірвелі, Юрацішкоўскага раена, Баранавіцкай вобласці (суч. Іўеўскага раена Гродзенскай вобласці). У складзе іх сям'і акрамя маці з бацькам былі яшчэ пяцера сясцер і чатыры браты. Адам Мустафавіч 1920 г.н. у адзначанае вайсковае фарміраванне трапіў у снежні 1943 г. Да вайны – гарбар, меў пачатковую адукацыю, беспартыйны. Разам з партызанамі атрада ен неаднаразова прымаў удзел у баявых